ўную магчымасьць вучыць сваіх дзяцей на ўнівэрсытэтах у Расеі й у Украіне, і імі гэтыя ўнівэрсытэты былі перапоўненыя. Беларуская засьценкавая шляхта, сялянства й мяшчанства такое магчымасьці ня мелі. Што ня дзеля „польскіх паноў“, але дзеля Беларусаў не дазваляла Расея мець Беларусі ўнівэрсытэту і іншых высокіх школаў, відаць таксама і з таго, што ў Беларусі ня была адчыненая навет праваслаўная духоўная акадэмія, хоць у ёй „польскія паны“, як каталікі, ня вучыліся–б.

Чытаньнік таксама паказаў, што адчыненьне цяперашняга ўнівэрсытэту ў Менску было ў вялікай меры прыгатавана беларускімі нацыянальнымі сіламі яшчэ да заняцьця Беларусі бальшавікамі. Бальшавіком, каб не скампрамітавацца, заставалася згадзіцца на прыгатаваную іншымі справу і канчальна ўжыцьцёвіць яе, карыстаючыся тымі–ж беларускімі нацыянальнымі сіламі, але ўжо будучы пад іхным загадам.

# Вянкі ўюць

У камэнтары да твораў Максіма Багдановіча, што цяпер друкуюцца ў „Бацькаўшчыне“, неаднойчы паўтараецца: „Верш ня ўплецены ў новую рэдакцыю «Вянка»“.

*Плятуць* рэчы грубыя, як кашы, лубкі, пляцёнкі. З гэтым згаджаецца й тое, што карэнь дзеяслова *пляту–плесьці* той самы, што й карэнь словаў *плот*, *пярэплат* (азярод), розьніца толькі ў ступені самагуку. Але ўжо пужку не плятуць, а *ўюць*. І пагатове не плятуць, а ўюць такую мастацкую рэч, як вянок. Калі ўюць вянок із красак і пад., дык уюць яго і зь вершаў. Ёсьць, праўда, і вершаплёты, але Багдановіч да іх не належа. Карэнь дзеяслова *ўю* (зь *вью*) — „віць“ той самы, што й карэнь слова *вянок*, розьніца толькі ў ступені самагуку. Гэтак, паходжаньне менаваных словаў згаджаецца зь іх ужываньнем у мове.

За адным гакам ня лішне мо’ будзе зацеміць, што паясы — *ткуць*. Таксама віцьцё розьніцца сваёй тэхнікай ад пляценьня. Прыклад на віцьцё вянка:

Дзевачкі йдуць, вяночкі ўюць,
Я свой разьвіваю.
Па красачцы, па васілёчку
Я свой раськідаю.

Песьня запісаная ў Імглінскім павеце (Косіч, 235 // Живая старина, 1901, т. II).

Падобных прыкладаў сустракаецца мноства з усіх беларускіх мясцовасьцяў.

Аднойчы здарылася мне чуць, як беларускі інтэлігент прасіў селавую дзяўчыну „сплесьці“ яму пояс, тая адчула гэта як зьнявагу свайму ўменьню і адказала, што *плесьці* пояса яна ня будзе, але — вытча.

# „Узыходзіла сонца незалежнае Беларусі“

**Да абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 25 сакавіка 1918 г.**
**(Успаміны)**

З таго часу мінула ўжо 40 год. Часта здаецца, што гэта было ўчора, адылі, розныя драбнейшыя стацьці, а таксама некаторыя асобы выпалі з памяці.

На пачатку зімы 1917 году дзякуючы стараньням братоў Луцкевічаў у нямецкай акупацыйнай улады я прыехаў або, праўдзівей, мяне прывёз аўстрыяцкі ахвіцэр Чэх з аўстрыяцкага палону да Вільні. У Вільні ўжо тады Беларусы мелі некаторыя няясныя ведамкі пра тое, што дзеялася ў часе вайны ў тэй большай часьці Беларусі, што засталася